Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Жукоўшчынская базавая школа”

# *Газета*

# Родная мова

*для выхавальнікаў дашкольнай адукацыі
бацькоў і выхаванцаў*

Выпуск № 1, верасень
2023 года



# *Верасень*

Непрыкметна зусім
Праплыве павуцінкай,
Гляне жоўтым лістком
З-пад зялёнай хусцінкі.
Зачаруе агнём
Маладзенькай рабіны,
На адлёце крылом
Памахае бусліным.

Пятрусь Броўка




## Народныя прыкметы

- Калі ў верасні лісце на дрэвах трымаецца моцна, чакай позняй зімы.
- Калі ў верасні павуціна на галінках дрэў развешана, значыць цёплыя дні наступаюць.
- Сухі і цёплы верасень -да позняй зімы.
- Увосень і верабей сыты.
- Восень – на дзень пагод восем.
- Прастаіць верасень сухі – зіма позняя будзе.
- Вераснёўскі гром абяцае цеплую восень.

## Чытаем беларускія казкі разам з дзецьмі

## Курачка-рабка

Жыў дзед, жыла бабка. Была ў іх курачка-рабка. Нанесла курачка яечак поўны падпечак. Сабрала бабка яечкі ў чарапіцу ды паставіла на паліцу. Мышка бегла, хвосьцікам махнула, чарапіца ўпала, яечкі пабіліся.

Плача дзед, плача бабка, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сарокі трашчаць, гусі крычаць, сабакі брэшуць.

Ідзе воўк:

- Дзедка, бабка, чаго вы плачаце?

- Як-жа нам ня плакаць? Была ў нас курачка-рабка. Нанесла курачка яечак поўны падпечак. Сабрала бабка яечкі ў чарапіцу ды паставіла на паліцу. Мышка бегла, хвосьцікам махнула, чарапіца ўпала, яечкі пабіліся.

І воўк завыў.

Ідзе мядзьведзь:

- Воўк, чаго выеш?

- Як-жа мне ня выць? Жыў дзед, жыла бабка. Была ў іх курачка-рабка. Нанесла курачка яечак поўны падпечак. Сабрала бабка яечкі ў чарапіцу ды паставіла на паліцу. Мышка бегла, хвосьцікам махнула, чарапіца ўпала, яечкі пабіліся. Плача дзед, плача бабка, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сарокі трашчаць, гусі крычаць, сабакі брэшуць... А я брахаць ня ўмею, дык і завыў.

Выслухаў мядзьведзь казку і адарваў сабе хвост.

Так з таго часу і жыве з куртатым хвастом.

# Прагулка ў парк і на возера





